**«ГУ́ТАРКА ДВУХ СУСЕ́ДАЎ»**, цыкл беларускіх ананімных вершаваных твораў 19 ст. Мае выразны антыцарскі і антыпрыгонніцкі змест. Выдаваўся лацініцай у падп. друкарні ў

Беластоку. У 1861—62 выйшлі 4 невял. 4-старонкавыя брашуркі. Усе яны пабудаваны ў форме дыялога 2 сялян — спрактыкаванага Матэвуша і наіўнага Юзафа. У 1-м нумары раскрываецца драпежніцкая сутнасць агр. рэформы 1861. Па словах Матэвуша, «цар ніц зрабіць не можа, тылька хоча ашукаці». Селянін параўноўвае цара з антыхрыстам, які спусташае двары, зневажае веру («крыж з Хрыстусам парубалі»). Адзінае выратаванне — вяртанне «ронду» польск., які прынясе свабоду і дабрабыт. У 2-м нумары ствараецца апакаліптычны малюнак — за грахі цара Бог помсціць мужыку: не родзіць зямля, не маюць літасці паны і чыноўнікі. Беларусаў невядомы аўтар гутаркі ўспрымае як «народ Польскі свенты». Адсюль і парада, якую ён дае: аднавіць святы каталіцызм, вярнуцца да дэмакр. Рэчы Паспалітай. У 3-м нумары Матэвуш тлумачыць прычыны адмены прыгону: «Француз у Севастопалі стаў Маскву ваяваці». Крымская вайна адлюстроўваецца як помста прыгоннікам за ўсе крыўды мужыка. 4-ы нумар мае куды больш радыкальны характар, тут гучыць заклік «граць у остры косы», далучацца да агульнапольск. паўстання: «А палякі за нагроду // Дадуць землю і свабоду». Паводле паліт. скіраванасці маналогі Матэвуша нагадваюць выказванні Яські-гаспадара з-пад Вільні (газ. «*Мужыцкая праўда*»): аднолькавая ідэалізацыя мінуўшчыны, аднолькавыя аргументы на карысць узброенага паўстання (русіфікацыя, рэкрутчына, прыгон). Паводле дыялагічнай формы і выразнай прапольск. арыентацыі твор блізкі да «Гутаркі аднаго паляка з маскалём» Г.Пельгрымоўскага (1603). *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова